будзе гэта аспрэчваць і ў якасці агульнапрызнанага факта гэта павінна на ўсе часы пацвердзіць сапраўднасць і годнасць таямнічага, жудаснага аповеду ў літаратуры» [3].

3) акрамя галоўных герояў у творы прысутнічаюць і антыгероі або інфернальныя істоты: прывіды, ведзьмы, варажбіткі, монстры і інш. Напрыклад, у рамане «Франкенштэйн» Мэры Шэлі апавядаецца пра вучонага Віктара Франкенштэйна, які спасціг таямніцу зараджэння жыцця і здолеў стварыць істоту ў выглядзе монстра.

4) падзеі часта адбываюцца ў напаўразбураным замку або манастыры з цёмнымі калідорамі, забароненымі для ўваходу памяшканнямі, энтрапічным пахам, або ў вёсцы, на могілках ці ў нейкай бязлюднай мясцовасці. Так, у рамане «Дракула» Брэма Стокера асноўныя падзеі адбываюцца ў замку Дракулы, а таксама – на могілках, у закінутых і бязлюдных месцах, старых дамах і вуліцах, дрымучых лясах.

5) галоўнай гераіняй часта з'яўляецца дзяўчына або жанчына з паламаным лёсам, якая бавіць час у адзіноце і марыць аб новай шчаслівай будучыні. Так, у рамане «Джэйн Эйр» Шарлоты Брантэ адлюстравана кранальная гісторыя цяжкага дзяцінства, юнацтва і кахання галоўнай гераіні. Разам з тым, заўважым, што названы твор не з'яўляецца праявай чыстай готыкі, бо аўтар скіроўвае сваю ўвагу не столькі на эстэтыку жаху, колькі на фіксацыю думак, пачуццяў і апісанне радасцяў і нягод у лёсе Джэйн.

Такім чынам, адметнасцю гатычнага рамана з'яўляюцца вусцішныя краявіды, разбураныя старажытныя замкі, напоўненыя прывідамі і зданямі. таямнічыя сутарэнні, бандыты і харызматычныя злодзеі, гіпербалізацыя прадчування жахлівых нечаканых падзей і жудасныя вобразы фізічнай дэградацыі і энтрапіі як наступстваў родавага праклёну ці страшнай сямейнай таямніцы.

*Літаратура*


1. Watt, I. The Rise of the Novel [Electronic resource] / I. Watt. – Mode of access: http://www.uni-koeln.de/phil-fak/englisch/lehre/downloads/ essaythemen_ma.htm. – Date of access: 23.03.2019.
2. Готический роман: Замок Отранто. Итальянец. Аббатство кошмаров : повести, роман ; пер. с англ. ; предисл. Л. Сумм ; примеч. Е. Гениевой. – М. : Эксмо, 2007. – 736 с.
3. Лавкрафт, Г. Сверхъестественный ужас в литературе [Электронный ресурс] / Г. Лавкрафт. – Режим доступа: http://lib.ru/INOFANT/LAWKRAFT/ sverhestestvennyj_uzhas_v_literature.txt. – Дата доступа: 23.03.2019.



УДК 80


## АНАМАСТЫЧНАЕ І АСАЦЫЯТЫЎНАЕ ПАЛІ Ў СТРУКТУРЫ КАНАТОНІМАЎ З НАЦЫЯНАЛЬНА-КУЛЬТУРНЫМ КАМПАНЕНТАМ

## ONNOMASTIC AND ASSOCIATIVE FIELD IN THE STRUCTURE OF CONNOTES WITH THE NATIONAL-CULTURAL COMPONENT


А. М. Рагілевіч
A. M. Rahilevich
БДПУ (Мінск)
Навук. кір. – Н. П. Лобань, канд. філал. навук, дацэнт



У артыкуле акрэсліваюцца паняцці анамастычнага і асацыятыўнага палей, вызначаюцца асноўныя кампаненты. Разгядаецца палявая структура канатоніма з нацыянальна-культурным кампанентам – Рагнеда. Прызначаецца для студэнтаў і выкладчыкаў ВНУ і для настаўнікаў беларускай мовы і літаратуры, гісторыі Беларусі.

The article defines the concept of onomastic and associative fields, defines the basic components. The field structure of the cannonim with the national-cultural component - Rogneda. It is intended for students and teachers of universities and for teachers of the Belarusian language and literature, history of Belarus.



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Ключавыя словы: канатацыя; канатонім; нацыянальна-культурны кампанент; анамастычнае поле; асацыятыўнае поле.

Key words: connotation; connotonim; national and cultural component; onnomastic field; associative field.

Тэрмін **анамастычнае поле** абазначае *сістэмна-структурнае аб’яднанне ў сістэме мовы, якое “мае на ўвазе наяўнасць сістэмна-структурных адносін і сувязей, выступае як упарадкаваная, іерархізаваная сукупнасць уласных імён”* [1, с. 42]. У АСТСА (ОСТСО) анамастычнае поле трактуецца як “група ўласных імён у пэўнай прасторы з агульнымі прыкметамі фармальнага ці семантычнага роду”, а таксама як *частка лексічнага поля, што змяшчае ўласныя імёны, сярод якіх і тапанімічнае, антрапанімічнае поле і г.д* [5, с. 138]. Паняцце анамастычнага поля актыўна апрабавана перш за ўсё ў рускай анамастыцы. Працы А. В. Суперанскай “Тэорыя ўласнага імя”, В. І. Супруна “Анамастычнае поле рускай мовы і яго мастацка-эстэтычны патэнцыял”, калектыўная манаграфія “Тэорыя і методыка анамастычных даследаванняў” набылі агульналінгвістычны статус. Паводле В. І. Супруна **анамастычнае поле** – гэта *рэальна вылучаная моўная структура, упарадкаваная, іерархічная сукупнасць уласных імёнаў*, *якая прадугледжвае наяўнасць ядзерна-перыферыйных і сістэмна-структурных адносін і сувязей, сэмантычнай агульнасці* [6, с. 9]. У цэнтры анамастычнага поля вылучаюць нязначнае па аб’ёме элементаў **ядро**; побач з ім знаходзіцца **каляядзерная прастора**, **перыферыя**, якая мае занальную структуру – у ёй вылучаюцца блізкая, далёкая і крайняя зоны [2, с. 85.]. Дадзеная структура характарызуецца дастатковай устойлівасцю, стабільнасцю, але ў той жа час не пазбаўлена і функцыянальнай рухомасці. Каардынацыя ўласных імён паміж ядром і перыферыяй залежыць ад аб’ёму семантыкі, а таксама ад шырыні набору функцый, якія онім выконвае ці здольны выконваць ва ўмовах вузкага ці пашыранага кантэксту. Па-другое, гэта сувязі прыцягнення ці адштурхоўвання, якія складаюцца ў структурных аб’яднаннях анімічных адзінак унутры сістэмы і забяспечваюць яе адзінства і цэласнасць [1, с. 150]. Варта адзначыць, што палявая структура анамастычнай прасторы з вылучэннем у ёй ядзернай, каляядзернай і перыферыйнай частак прымяняецца ў сістэме мовы, дзе ядро азначае канцэнтрацыю прыкмет сістэмы, а перыферыя – іх аслабленне [4, с. 36].

Антрапанімічнае поле характарызуецца даволі складанай унутранай формай. Яго мадэль у творчасці кожнага аўтара складаецца з асобных, непаўторных кампанентаў, якія кожны раз па-іншаму паводзяць сябе ў тых ці іншых тэкстуальных абставінах [1, с. 151].

Услед за А. В. Суперанскай і В. І. Супруном будзем разглядаць анамастычную прастору як палявую структуру, улічваючы спецыфіку канатонімаў з нацыянальна-культурным кампанентам. Шырокая вядомасць канатонімаў з нацыянальна-культурным кампанентам часта дазваляе ўжываць іх з комплексам асацыяцый. Гэта прыводзіць да вылучэння ў структуры канатоніма не толькі анамастычнага, але і асацыятыўнага поля. Адзначым, што асацыятыўныя палі вывучаюцца ў такім раздзеле мовазнаўства, як псіхалінгвістыка.

У артыкуле К. А. Бурнаевай “Асацыятыўнае поле як спосаб мадэлявання фрагмента моўнай свядомасці” **асацыятыўнае поле** разглядаецца як *‘інструмент вывучэння канцэпта ў нацыянальнай канцэптасферы пры ўмове вялікай колькасці інфармантаў, і ў індывідуальнай канцэптасферы, калі вывучаюцца асацыяцыі асобнага чалавека’*. Асноўнымі кампанентамі асацыятыўнага поля з’яўляюцца *ядро, перыферыя*, якія складаюцца з асацыятаў, суаднесеных іерархічна, парадыгматычна і сінтагматычна. Ядро асацыятыўнага поля ўключае істотныя частотныя асацыяцыі, а перыферыя – менш частотныя.

Разгледзім палявую структуру канатоніма з нацыянальна-культурным кампанентам на прыкладзе оніма *Рагнеда*. Так, *ядром* гэтага канатоніма з’яўляецца ключавая агульнавядомая інфармацыя: *княжна полацкая, або полацкая князёўна, дачка першага*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*летапіснага князя полацкага Рагвалода, адна з жонак вялікага князя кіеўскага Уладзіміра Святаславіча*. *Семантычную перыферыю* канатоніма складаюць шырокія звесткі пра анамастычны аб’ект: *палачанка; полацкая князёўна; крывічанка; дачка крывіцкага князя; крывічанка-князёўна; святая манашка; выгнанніца-чарніца; першая на Русі манашка* і інш. Эмацыянальна-ацэначныя асацыяцыі, звязаныя з аб’ектам, які называе онім, складаюць *асацыятыўны арэол імя*. Да іх аднясём такія семы, як *светлая князёўна* (Дудараў А. Палачанка)*; княства вольнага кветка* (Багдановіч І. Палачанка)*; князёўна-гарэза* (Багдановіч І. Палачанка); *княгінька на вёсачцы* (Тарасаў К. Тры жыцці княгіні Рагнеды)*; гаспадыня глухога двара* (Тарасаў К. Тры жыцці княгіні Рагнеды)*; жывы мярцвяк* (Тарасаў К. Тры жыцці княгіні Рагнеды)*; вечная парадзіха* (Тарасаў К. Тры жыцці княгіні Рагнеды)*; палюбоўніца княжая* (Тарасаў К. Тры жыцці княгіні Рагнеды)*; прыбітая істота* (Тарасаў К. Тры жыцці княгіні Рагнеды)*; Лыбядзянка* (Тарасаў С. Лыбядзянка)*; палюбоўніца-каханка* (Тарасаў С. Лыбядзянка)*; спадчыніца полацкага княства* (Марціновіч А. Ой ты, княжна, ды свабодная…)*; жонка-зладзейка* (Марціновіч А. Ой ты, княжна, ды свабодная…)*; сумная княгіня* (Шпакоўскі-Случанін Л. Рагнеда)*; гордая крывіцкая княгіня* (Шпакоўскі-Случанін Л. Рагнеда)*; няўдалая царэўна* (Рублеўская Л. Рагнеда); *чорная лебедзь* (Вольскі А. Выгнанне Рагнеды)*; вольная птушка* (Вольскі А. Выгнанне Рагнеды); *апостал духу* (Квяткоўская Я. Апостал духу)*; княжна свабодная* (Купала Я. Гарыслава)*; гардыня недаступная* (Купала Я. Гарыслава); *князёўна-чарніца* (Лукша В. Князёўна-чарніца); *нявестка-кветка* (Ягоўдзік У. Аповесць пра князёўну Рагнеду); *нявольніца-княгіня* (Ягоўдзік У. Аповесць пра князёўну Рагнеду).

Такім чынам, асацыятыўнае поле канатоніма з нацыянальна-культурным кампанентам – мадэль, якая паказвае значнасць канкрэтнага слова для дадзенай мовы. Іншымі словамі, гэта кантэксты ўжывання оніма, якія адлюстроўваюць яго камунікатыўны патэнцыял.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

*Літаратура*

1. Гапоненка, І. Беларускі іменаслоў перыяду першага беларускага адраджэння: Каталіцкія і праваслаўныя імёны / І. Гапоненка // Роднае слова. – 2001. – № 10. – С. 42–44.
2. Зиннатуллина, Г. Х. Ономастическое пространство художественных текстов / Г. Х. Зиннатуллина // Филологические науки. Вопросы теории и практики. – Тамбов, 2014. – С. 84–87.
3. Мезенка, Г. М. Беларуская антрапанімія : вучэб. дапам. для студ. выш. навуч. устаноў па філалагічных спец. / Г. М. Мезенка, Г. М. Дзеравяга. – Віцебск : УА "ВДУ імя П. М. Машэрава", 2009. – 254 с.
4. Никитина, Н. В. Ономастическое пространство поэзии А. Т. Твардовского : дисс. … канд. филол. наук : 10.02.01 / Н. В. Никитина. – Смоленск, 2006. – 226 с.
5. Основен систем и терминологија на словенската ономастика. Основная система и терминология славянской ономастики. Grundsystem und Terminologie der slawischen Onomastik / hg. von B. Vidoeski. Скопје ; Скопье ; Skopje : Македонска Академија на науките и уметностите : Мегународен комитет на славистите : Комистја за словенска ономастика, 1983. – 414 с.
6. Супрун, В. И. Ономастическое поле русского языка и его художественно-эстетический потенциал / В. И. Супрун. – Волгоград : Перемена, 2000. – 171 с.

УДК 81'373:811.512.164

## КАРТИНА МИРА ЧЕРЕЗ ПРИЗМУ ТУРКМЕНСКОЙ ФРАЗЕОЛОГИИ

## PICTURE OF THE WORLD THROUGH THE PRISM OF TURKMEN PHRASEOLOGY